30-ая гадавіна прыняцця біскупскай сакры пастыра дыяцэзіі

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
30.05.2021 00:00



У гэты дзень вернікі маглі не толькі маліцца за свайго пастыра, але і асабіста выказаць яму віншаванні. Ва ўрачыстасць Спаслання Святога Духа біскуп Гродзенскі Аляксандр Кашкевіч адзначаў 30-годдзе прыняцця біскупскай сакры. Яна адбылася 23 мая 1991 года ў катэдральнай базіліцы св. Францішка Ксаверыя ў Гродне. Галоўным кансэкратарам пасвячэння быў арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч. †
У гэты важны для сябе дзень іерарх наведаў дзве парафіяльныя супольнасці нашай дыяцэзіі – санктуарый Пана Езуса Журботнага ў Росі і парафію Узвышэння Святога Крыжа ў Лідзе.

Цэлебруючы ўрачыстыя св. Імшы ў гэтых святынях, іерарх сваімі малітвамі ахінаў усіх, хто стварае Гродзенскі Касцёл – вернікаў і духавенства. Падчас гэтых Эўхарыстый біскуп таксама ўдзяліў вернікам сакрамант хрысціянскай сталасці.

30-ая гадавіна прыняцця біскупскай сакры пастыра дыяцэзіі

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
30.05.2021 00:00

